# НАСЛЕДАВАННЕ МАЁМАСЦІ ПА ЗАВЯШЧАННЮ Ў СТАТУЦЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1588 ГОДА

*Л. Л. Голубева*

Беларускі дзяржаўны універсітэт,
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

Автор рассматривает вопрос правового регулирования наследования имущества по завещанию согласно Статуту Великого Княжества Литовского 1588 года. Отмечается, что закон с большим уважением относился к нотариальным завещаниям, признавал домашнюю форму, которая требовала присутствия свидетелей.

Аўтар разглядае пытанне прававога рэгулявання наследаванне маёмасці па завяшчанню згодна Статута 1588 года. Адзначаецца, што закон з большай павагай адносіўся да натарыяльных завяшчанняў, прызнаваў дамашнюю форму, якая патрабавала прысутнасці сведак.

The author considers the legal regulation of inheritance of property by will in accordance with the Statute of the Grand Duchy of Lithuania of 1588. It is noted that the law respected notarial wills, recognized the home form, which required the presence of witnesses.

***Ключевые слова:*** наследование имущества по завещанию; Статут Великого Княжества Литовского 1588 года; действительность воли завещателя и его дееспособность.

***Ключавыя словы:*** наследванне маёмасці па завяшчанню; Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года; рэчаіснасць волі завяшчацеля і яго дзеяздольнасць.

***Keywords:*** inheritance of property by will; the Statute of the Grand Duchy of Lithuania of 1588; validity of the will of the testator and his legal capacity.

У восьмым раздзеле Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 года (далей – Статут 1588 года) разглядаюцца пытанні наследавання па завяшчанню [5]. Першапачатковая форма завяшчання (заклік Св. Троіцы) указвае на тое, што права наследавання ў сваім гістарычным развіцці знаходзілася пад уплывам царквы [3, с. 474]. У першую чаргу гаварылася аб тым, хто меў права завяшчаць нерухомую маёмасць, якім

чынам афармляўся завяшчальны запіс, хто павінен быў пры гэтым прысутнічаць, рэгламентаваліся прычыны прызнання завяшчання несапраўдным і г. д. Свабода складання завяшчанняў, у першую чаргу, тычылася рухомай маёмасці. Статут 1588 года замацаваў і некаторыя абмежаванні адносна распараджэння нерухомай фамільнай маёмасцю, а таксама адносна сумесна нажытай у шлюбе маёмасцю (р. V, арт. 2, 21 і інш.).

Статут 1588 года, рэгламентуючы наследаванне маёмасці па закону, па завяшчанню і па звычаю, устанаўлівае кола асоб, якія мелі права складаць завяшчанні, а таксама гаворыць аб суб'ектах, у якіх такога права не было [4, с. 16 – 17]. Да іх адносіліся асобы, свабодна не валодаючыя маёмасцю, непаўналетнія дзеці, манахі, не аддзеленыя ад бацькі сыны (за выключэннем самастойна набытай маёмасці або выслужанай), вар'яты, для якіх рабілася выключэнне «коли ко доброму и досконалому розуму придуть, моцни тэстаменты свои чинити» (р. VIII, арт. 1). Закон забараняў таксама рабіць завяшчальныя запісы асобам, прысуджаным да пазбаўлення гонару і да выгнання.

Вялікую ўвагу Статут 1588 года надаваў парадку афармлення завяшчальных запісаў (тэстаментаў). Як правіла, яны павінны былі складацца ў прысутнасці членаў гродскага або земскага суда, а пры немагчымасці – у прысутнасці аднаго члена суда і двух мясцовых шляхцічаў. Усе асобы, якія прысутнічалі пры складанні тэстамента павінны былі яго падпісаць і заверыць асабістай пячаткай. Завяшчацель меў права ў любы момант змяніць завяшчанне і напісаць новы тэстамент. Сапраўдным прызнаваўся апошні завяшчальны запіс.

У выпадку адсутнасці хаця б аднаго судовага чыноўніка завяшчанне складалася ў прысутнасці трох шляхцічаў. У Статуце 1588 года гаворыцца «А не может ли быти и один который урядник, тогды перед трема шляхтичами в том панстве нашом, Великом князстве Литовском, оселыми людми, веры годными может тестамент справити» (р. VIII, арт. 2). Пасля смерці завяшчацеля, складзенае такім чынам завяшчанне павінна быць адразу прадстаўлена ў бліжэйшы гродскі суд, а потым яно аб'яўлялася перад вялікім князем або земскім судом, і запісвалася ў судовыя кнігі. Закон патрабаваў пералічваць кожную завяшчаемую рэч паімённа. Не дапускаліся падчысткі і выпраўленні ў складзеным дакуменце. У адваротным выпадку завяшчанне або тая яго частка, у якой меліся выпраўленні, лічылася несапраўднай (р. VIII, арт. 6).

Закон рэгламентаваў і экстраныя выпадкі складання завяшчання. Так, калі завяшчанне складалася на вайне, або дзе-небудзь у дарозе, або ў чужой зямлі, яно прызнавалася сапраўдным у выпадку сведчання траіх

(у крайнім выпадку дваіх) дастойных даверу шляхцічаў. Такі тэстамент сведчыў вялікі князь або гродскі ці земскі суд. У ваенны час завяшчанне сведчылі таксама ваеначальнікі (гетман або павятовы харужы), што пацвярджалі сваёй прысягай сведкі (р. VIII, арт. 4).

Закон устанаўліваў пералік асоб, якія не маглі сведчыць завяшчальны запіс. Да іх адносіліся тыя асобы, якія самі не мелі права складаць завяшчанне, жанчыны, апекуны той маёмасці, на якую складалася завяшчанне, а таксама тыя асобы, якім у гэтым завяшчанні завяшчалася хаця б частка дадзенай маёмасці (р. VIII, арт. 3).

Статут 1588 года дазваляў кожнаму жыхару дзяржавы завяшчаць набытыя маёнткі, цэрквы, аднак абавязваў у такім выпадку духавенства «службу нашу земскую военную конно, збройно водлуг уставы и уфалы земское по тому же заровно из иншою шляхтою служити...» (р. VIII, арт. 3).

Закон замацаваў шэраг прычын, па якіх бацькі маглі адмовіцца ад сваіх дзяцей, вынікам чаго было пазбаўленне іх права на спадчыну. Запазычанні гэтыя былі зроблены з тлумачэнняў да Саксонскага зерцала [2, с. 28].

У законе гаварылася аб наследаванні маёмасці феадальна-залежных людзей. Яны мелі права адказать трэцюю частку сваёй маёмасці староннім асобам, а дзве часткі заставаліся дзецям. У выпадку адсутнасці дзяцей гэтыя дзве часткі паступалі ў распараджэнне гаспадзіна. Чэлядзь дамашняя і палонныя маглі таксама наследаваць маёмасць па завяшчанню, але закон патрабаваў перш аформіць ім вольную (р. VIII, арт. 8, 9).

У актах Слонімскага земскага суда мы знаходзім прыклады складання завяшчальных запісаў. Так, Смаленскі ваявода Васіль Цішкевіч, склаў 4 завяшчанні на карысць сваіх дзяцей (ад двух жонак) [1, с. 225]. Цікавымі з’яўляюцца завяшчанні Ірыновіча (ад 9 мая 1566 года) і Гарабурды (ад 3 кастрычніка 1570 года) [1, с. 339]. Павел Ірыновіч завяшчаў сваёй жонцы ўсю маёмасць, якая знаходзілася ў двух яго маёнтках. Згодна з завяшчаннем на волю была адпушчана дворная чэлядзь. Аляксандар Гарабурда адпісаў сваім дзядзьям Міхаілу і Луке Багдановічам Гарабурдам сёлы ў зямлі Полацкай, якія дасталіся яму па спадчыне ад маці.

Галоўнае, на што заканадаўца XVI стагоддзя звяртае ўвагу, гэта рэчаіснасць волі завяшчацеля і яго дзеяздольнасць у момант складання завяшчання. У сувязі з гэтым важнейшай умовай рэчаіснасці завяшчальных запісаў было патрабаванне прытрымліватца ўстаноўленай законам формы і працэдуры складання завяшчання. Закон з большай павагай адносіўся да натарыяльных завяшчанняў, хаця прызнаваў і дамашнюю форму, якая патрабавала прысутнасці сведак.

Завяшчанне, якое не адпавядала ўнутраным і знешнім умовам, магло быць аспрэчана ў судовым парадку.

### Бібліяграфічныя ссылкі

1. Акты издаваемые Виленскою Археографическою комиссiею : в 39 т. Вильна : Типогр. А. Г. Сыркина, 1865–1915. Т. 28: Акты Слонимского земского суда / предисл. И. Спрогиса. 1879. XXXVIII, 592, 48 с.

2. Бершадский С.А. О наследовании в выморочных имуществах по литовскому праву. СПб. : Тип.-титогр. *А*.Е. Ландау, 1892. 94 с.

3. Владимирский-Буданов М.Ф. Обзор истории русского права: Лекции. Р-н-Д. : Изд-во «Феникс», 1995. 639 с.

4. Доўнар Т.І. Нормы спадчыннага права ў Статуце 1588 года // Конституционно-правовая реформа в Республике Беларусь (проблемы и перспективы). Тезисы докл. конф. Минск : БДУ, 1997. С. 16 – 17.

5. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 : Тэксты. Давед. Камент. / Бел. сав. энцыкл. ; рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.] Мінск : БелСЭ, 1989. 573 с.

## МЕСТНЫЕ ПРЕДСТАВИТЕЛЬНЫЕ ОРГАНЫ ВЛАСТИ ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО

***Е. И. Орловская***

Белорусский государственный университет,
г. Минск, Республика Беларусь

В статье освещается вопрос истории формирования и функционирования представительных органов Великого Княжества Литовского. Автор приходит к выводу о том, что деятельность местных представительных органов в Великом Княжестве Литовском была, с одной стороны, очень зависима от внутриполитических процессов, а, с другой, оказывала определенное влияние на все события, происходившие в стране.

У артыкуле асвятляецца пытанне гісторыі фарміравання і функцыянавання прадстаўнічых органаў Вялікага Княства Літоўскага. Аўтар прыходзіць да высновы аб тым, што дзейнасць мясцовых прадстаўнічых органаў у Вялікім Княстве Літоўскім была, з аднаго боку, вельмі залежная ад унутрыпалітычных працэсаў, а, з другога, аказвала пэўны ўплыў на ўсе падзеі, якія адбываліся ў краіне.

The article highlights the issue of the history of the formation and functioning of representative bodies of the Grand Duchy of Lithuania. The author comes to the conclusion that the activity of local representative bodies in the Grand Duchy of Lithuania was, on the one hand, very dependent on internal political processes, and, on the other hand, had a certain influence on all the events taking place in the country.